# Пункт карэкцыйна – педагагічнай дапамогі

**Падрыхтавала:А.А.Капцюг, настаўнік – дэфектолаг**
**ДУА «Нарацкая сярэдняя школа Вілейскага раёна»**

# Мэты дзейнасці ПКПД

- стварэнне сістэмы дапамогі навучэнцам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія маюць розныя парушэнні вуснай і пісьмовай мовы ў засваенні асноўнай адукацыйнай праграмы пачатковай агульнай адукацыі;
- карэкцыя недахопаў у маўленчай дзейнасці і псіхічным развіцці навучэнцаў;
- стварэнне спецыяльных умоў навучання і выхавання, якія дазваляюць ўлічваць асаблівыя адукацыйныя патрэбы дзяцей з АПФР з дапамогай індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі адукацыйнага працэсу.

# Задачы ПКПД

- своечасовае выяўленне дзяцей з АПФР; вызначэнне асаблівых адукацыйных патрэбаў дзяцей з АПФР; вызначэнне асаблівасцяў арганізацыі адукацыйнага працэсу для даннай катэгорыі дзяцей у адпаведнасці з індывідуальнымі асаблівасцямі кожнага дзіцяці, структурай парушэння маўленчага развіцця і ступенню яго выяўленасці;
- стварэнне ўмоў, якія спрыяюць асваенню дзецьмі з АПФР асноўнай адукацыйнай праграмы пачатковай агульнай адукацыі і іх інтэграцыі ў адукацыйнай установе; арганізацыя індывідуальных, падгруппавых заняткаў для навучэнцаў;
- аказанне кансультатыўнай і метадычнай дапамогі бацькам і педагогам (законным прадстаўнікам) па педагагічных і іншых пытаннях.

Своечасовае авалоданне правільнай, чыстай мовай мае вялікае значэнне для фарміравання паўнавартаснай асобы. Чалавек з добра развітой мовай лёгка ўступае ў зносіны. Ён можа зразумела выказваць свае думкі і жаданні, задаваць пытанні, дамаўляцца з партнёрамі аб сумеснай дзейнасці. Правільная, добра развітая гаворка з'яўляецца адным з асноўных паказчыкаў гатоўнасці дзіцяці да паспяховага навучання ў школе.

Недахопы вымаўлення могуць прывесці да непаспяховасці навучэнца, стаць прычынай няўпэўненасці ў сваіх сілах, а гэта будзе мець далёка ідучыя негатыўныя наступствы. Цяжкасці ў гукавымаўленні часта ўплываюць на самаацэнку дзіцяці і яго становішча ў дзіцячым калектыве. Вучні, якія дрэнна размаўляюць, паступова пачынаюць усведамляць свой недахоп. Тады яны становяцца маўклівымі, сарамлівымі, замкнёнымі. А гэта яшчэ больш затрымлівае развіццё мовы дзіцяці.

На базе пункту карэкцыйна – педагагічнай дапамогі ДУА “Нарацкая сярэдняя школа Вілейскага раёна” займаюцца 20 дзяцей з лагапедычнымі дыягназамі “Агульнае недаразвіццё мовы, дысграфія, дыслексія”. З іх 11 чалавек – дашкольнікі, а 9 – вучні 1-2-х класаў.

Карэкцыйна – развіваючая работа настаўніка – дэфектолага ў школе з навучэнцамі з АПФР заключаецца ў:

- правядзенні карэкцыйна – развіваючых заняткаў па ліквідацыі розных маўленчых парушэнняў;
- развіцці і ўдасканаленні вуснай мовы;
- фарміраванні правільнага гукавымаўлення;
- фарміраванні фанематычнага слыху, на базе якога ажыццяўляецца карэкцыя працэсаў пісьма і чытання.

# Арганізацыя заняткаў у пункце карэкцыйна - педагагічнай дапамогі




19 красавіка
Класная работа.




за — школа
да
















19 красавіка
Класная работа

Парушэнні вуснай мовы непазбежна прыводзяць да парушэння пісьмовай мовы – дыслексіі і дысграфіі – гэта спецыфічныя (не арфаграфічныя) памылкі чытання і напісання: замена літар у адпаведнасці з няправільным гукавымаўленнем, зрокава падобных літар, люстраное ці злітнае напісанне прыназоўнікаў або слоў, граматычныя памылкі, палітарнае чытанне.

З гэтага вынікае, што карэкціраваць моўныя парушэнні неабходна ў дашкольным узросце ці хаця б у малодшым школьным. У адваротным выпадку гэта негатыўна адаб'ецца на школьнай паспяховасці і на фарміраванні асобы дзіцяці ў цэлым.

# Дзякуй за ўвагу!